Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

МИНСК, ЦК КП(б)Б, сектор печати
„Сов. Радз." — 2 экз.

...эларусі

Орган Бабруйскага абкома і гаркома КП(б)Б, абласнога і гарадскога Советаў дэпутатаў працоўных

# Совецкая РАДЗІМА

№ 63 (90)
Чацвер 19 красавіка
Цана 20 кап.

# ЗАГАД

## Вярхоўнага Галоўнакамандуючага
## Камандуючаму войскамі 2-га Украінскага фронта Маршалу Совецкага Саюза МАЛІНОЎСКАМУ
## Начальніку штаба фронта Генерал-палкоўніку ЗАХАРАВУ

Войскі 2-га **Украінскага** фронта, прадаўжаючы наступленне, сёння, 17 красавіка, авалодалі цэнтрам нафтаноснага раёна Аўстрыі— горадам **Цістэрсдорф**.

У баях за авалоданне горадам **Цістэрсдорф** вызначыліся войскі генерал-палкоўніка **Шумілава**, генерал-маёра **Лукіна**, генерал-маёра **Крузэ**, генерал-маёра **Осташэнка**, генерал-маёра **Грыгаровіча**, палкоўніка **Орлова**, генерал-маёра **Смірнова**, генерал-маёра **Лосева**, генерал-маёра **Грэчанава**, генерал-маёра **Гарбачова**, палкоўніка **Мароль**, палкоўніка **Панова**, палкоўніка **Еромiна**, палкоўніка **Салычэва**; артылерысты генерал-лейтэнанта артылерыі **Дзерэша**, генерал-лейтэнанта артылерыі **Петрова**, палкоўніка **Міронава**, палкоўніка **Багушэвіча**, палкоўніка **Паўліна**, падпалкоўніка **Буліна**, падпалкоўніка **Паплыка**, падпалкоўніка **Папалзухіна**; танкісты палкоўніка **Мельніка**, палкоўніка **Брыжынёва**, палкоўніка **Зэтрэану**; лётчыкі генерал-палкоўніка авіяцыі **Гарунова**, генерал-лейтэнанта авіяцыі **Селезнёва**, генерал-маёра авіяцыі **Каманіна**, генерал-лейтэнанта авіяцыі **Сцэпчэва**, генерал-лейтэнанта **Падгорнага**; сапёры палкоўніка **Цэпенюка**, падпалкоўніка **Езерскага**; сувязісты палкоўніка **Барысенка**, палкоўніка **Давыдава**, палкоўніка дзяржаўнай бяспекі **Карпава**.

У азнаменаванне атрыманай перамогі злучэнні і часці, якія найбольш вызначыліся ў баях за авалоданне горадам **Цістэрсдорф**, прадставіць да ўзнагароджання ордэнамі.

Сёння, 17 красавіка, у 21 гадзіну сталіца нашай Радзімы **Масква** ад імені Радзімы салютуе доблесным войскам 2-га **Украінскага** фронта, якія авалодалі горадам **Цістэрсдорф**, — дванаццаццю артылерыйскімі залпамі са ста дваццаці чатырох гармат.

За выдатныя баявыя дзеянні **аб'яўляю падзяку** кіруемым Вамі войскам, якія ўдзельнічалі ў баях за вызваленне **Цістэрсдорфа**.

Вечная слава героям, паўшым у баях за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы!

Смерць нямецкім захопнікам!

*Вярхоўны Галоўнакамандуючы*

*Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН.*

17 красавіка 1945 года. № 338.

# Ад Совецкага Інформбюро

## Аператыўная зводка за 17 красавіка

На працягу 17 красавіка на **Земландскім** паўвостраве, на захад ад **Кенігсберга**, войскі 3-га **Беларускага** фронта, прадаўжаючы наступленне, з баямі занялі горад і порт **Фішхаузен** і населеныя пункты **Літаусдорф**, **Гафкен**, **Занглінэн**, **Ноендорф**, **Дарген**, **Тэнкітэн**, **Кальштайн**, **Легінэн**, **Розэнталь**, **Карльсхоф**, **Вішродт**, **Блюдау**, **Непленен**, **Цымербудэ**, **Пайзэ**. Рэшткі разгромленай групы нямецкіх войск адкінуты ў раён порта **Пілау**, дзе і знішчаюцца нашымі войскамі. У баях за 16 красавіка войскі фронта ўзялі ў палон 5650 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі наступныя трафеі: самалётаў—47, танкаў і самаходных гармат—47, бронетранспарцёраў—78, палявых гармат—385, мінамётаў—210, кулямётаў—730, аўтамашын—2512, трактараў і цягачоў—64, чыгуначных вагонаў—350, складаў з ваеннай маёмасцю—36.

Войскі 2-га **Украінскага** фронта, прадаўжаючы наступленне, 17 красавіка авалодалі цэнтрам нафтаноснага раёна Аўстрыі—горадам **Цістэрсдорф**, а таксама занялі больш 30 другіх населеных пунктаў і сярод іх **Нальтэрндорф**, **Маусрэнк**, **Кетласбрун**, **Паасдорф**, **Хеберсбрун**, **Вольфпасынг**, **Хаутцэндорф** і чыгуначную станцыю **Добермансдорф**, **Гесцінг**, **Паасдорф**. На тэрыторыі Чэхаславакіі на паўночны захад ад горада **Гадэнін**, войскі фронта занялі населеныя пункты **Крумвір**, **Шчытборыцэ**, **Кржэпіцэ**, **Густопечэ**, **Сатаровыцэ**, **Попіцэ**, **Врановіцэ**.

Войскі 3-га **Украінскага** фронта на тэрыторыі Аўстрыі, на поўнач і захад ад горада **Санкт-Пельтэн**, з баямі занялі населеныя пункты **Обер-Вельблінг**, **Амбах Хаузгейм**, **Обрыцберг**, **Вайтцэндорф**, **Герэрсдорф**, **Хафінг**.

На астатніх участках фронта—баі мясцовага значэння і пошукі разведчыкаў.

За 16 красавіка на ўсіх франтах падбіта і знішчана 86 нямецкіх танкаў і самаходных гармат. У паветраных баях і агнём зенітнай артылерыі збіта 50 самалётаў праціўніка.

# На прэс-канферэнцыі ў польскім пасольстве

17 красавіка ў польскім пасольстве ў Маскве адбылася прэс-канферэнцыя, на якой члены польскай профсаюзнай дэлегацыі, якія прыбылі ў Маскву, расказалі прадстаўнікам совецкага друку і замежным карэспандэнтам аб аднаўленні профсаюзнага руху ў Польшчы і дзейнасці існуючых профарганізацый.

Генеральны сакратар цэнтральнай польскай профсаюзнай камісіі пан Віташэўскі паведаміў, што польскія рабочыя прыступілі да аднаўлення сваіх профсаюзных арганізацый неадкладна пасля вызвалення польскай тэрыторыі ад нямецкіх захопнікаў Чырвонай Арміяй і часцямі Польскага войска. 21 лістапада 1944 года ў Любліне адбылася профсаюзная канферэнцыя, на якой была створана цэнтральная польская профсаюзная камісія, якая кіруе цяпер усім польскім профсаюзным рухам. Да гэтага часу профсаюзныя арганізацыі ў 6 важнейшых галінах прамысловасці маюць свае цэнтральныя аб'яднанні— галоўныя праўленні. Гэта—тэкстыльшчыкі, якія налічваюць у сваіх радах 74 тысячы членаў, гарнякі—27 тысяч, нафтавікі—7 тысяч, металісты—57 тысяч, рабочыя сахарных заводаў—23 тысячы і чыгуначнікі—133 тысячы членаў. Другія профсаюзныя арганізацыі кіруюцца ваяводскімі профаб'яднаннямі. На 1 красавіка 1945 года профсаюзы Польшчы налічвалі 644 тысячы арганізаваных рабочых.

— Польскія профсаюзы, якія налічваюць такую вялікую колькасць рабочых у сваіх радах,—прадаўжаў пан Віташэўскі,—былі здзіўлены і некалькі абесуражаны тым фактам, што яны не былі дапушчаны на адбыўшуюся ў лютым у Лондане сусветную профсаюзную канферэнцыю. Паколькі матывам адказа паслужыла не прызнанне часовага Польскага ўрада Англіяй і Злучанымі Штатамі Амерыкі, трэба асоба падкрэсліць,—сказаў пан Віташэўскі, — што профсаюзы Польшчы не звязаны з дзяржавай і не знаходзяцца пад кантролем якой-небудзь палітычнай партыі. Польскія профсаюзы з'яўляюцца незалежнымі і самастойнымі арганізацыямі рабочых.

Акрамя звычайных задач па абароне інтарэсаў рабочых і служачых, сказаў пан Віташэўскі, профсаюзы зараз дзейсна дапамагаюць органам дзяржавы ў аднаўленні прамысловасці, транспарта і другіх галін народнай гаспадаркі. Польскія профсаюзы актыўна ўдзельнічаюць у пабудове новай дэмакратычнай Польшчы.

На пытанне аднаго з удзельнікаў канферэнцыі, якая мэта прыезда польскай профсаюзнай дэлегацыі ў Маскву, пан Віташэўскі адказаў, што мэта прыезда дэлегацыі—устанавіць цесны дзелавы кантакт з совецкімі профсаюзамі. Адказваючы на другія пытанні, Віташэўскі адзначыў, што цэнтральная профсаюзная камісія ўстанавіла супрацоўніцтва з некаторымі польскімі профсаюзнымі арганізацыямі ў Англіі і Злучаных Штатах Амерыкі, у прыватнасці з польскім саюзам маракоў у Лондане. Спробы польскіх рэакцыянераў з групы Арцішэўскага выклікаць раскол у гэтым саюзе, дадаў пан Віташэўскі, закончыліся поўным правалам.

Прыбыўшы разам з профсаюзнай дэлегацыяй, прадстаўнік міністэрства працы пан Хендрык Альтман паведаміў аб ходзе аднаўлення прамысловых прадпрыемстваў у Польшчы.

—Дзяржава,—заўважыў пры гэтым пан Альтман,—бярэ ў сваю ўласнасць толькі тыя прадпрыемствы, якія знаходзіліся ў дзяржаўнай уласнасці да 1939 года. На астатніх прадпрыемствах, дзе адсутнічаюць уладальнікі, устанаўліваецца дзяржаўны кантроль. Па меры звароту ў Польшчу ўладальнікаў гэтых прадпрыемстваў дзяржава будзе аднаўляць іх права ўладання, калі яно будзе пацверджана адпаведнымі дакументамі.

У час канферэнцыі карэспандэнты паставілі пытанне, як глядзяць польскія профсаюзы на прыцягненне германскай рабочай сілы для аднаўлення разбуранай гітлераўцамі польскай прамысловасці. Польскія рабочыя лічаць, сказаў пан Віташэўскі, што немцы павінны аднавіць тое, што яны разбурылі ў Польшчы.

(ТАСС).

